*Крук, М. В.* Тэрытарыяльная мабільнасць насельніцтва Беларусі ў пачатку XX ст. (па матэрыялах «Нашай нівы») / М. В. Крук // XXI век: актуальные проблемы исторической науки: Материалы междунар. науч. конф., посвящ. 70-летию ист. фак. БГУ. Минск, 15–16 апр. 2004 г. / Редкол.: В. Н. Сидорцов. (отв. ред.) и др. – Мн: БГУ, 2004. – С. 218–219.

**М. В. КРУК**
***Рэспубліка Беларусь, г. Мінск***

# ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАЯ МАБІЛЬНАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ XX ст. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ «НАШАЙ НІВЫ»)

Матэрыялы першай беларускай газеты «Наша Ніва» дазваляюць узнавіць розныя бакі жыцця многіх слаёў тагачаснага грамадства на тэрыторыі як нашай краіны, так і за яе межамі. На старонках газеты разглядаліся праблемы беларускай культуры, адукацыі, падрыхтоўкі кадраў. Рэгулярна друкаваліся мастацкія творы беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. Цікавасць выклікаюць і матэрыялы, звязаныя з тэрытарыяльнай мабільнасцю насельніцтва Беларусі.

Нягледзячы на навуковую актуальнасць вызначанай праблемы, яе комплекснага аналізу ў Беларусі не было зроблена. Разгледжаны толькі прыватныя пытанні, звязаныя з заходнім накірункам эміграцыі беларускага насельніцтва і з выездам у Сібір [7, *9*]. Па гэтай прычыне любая інфармацыя, нават супярэчлівага характару, з'яўляецца важнай для вывучэння дадзенай тэмы. У сувязі з гэтым матэрыялы «Нашай Нівы» – даволі каштоўная крыніца па праблеме, прычым не толькі для даследавання пяці беларускіх губерняў, але і для Расійскай імперыі ў цэлым.

Пытанні, звязаныя з міграцыямі, ніколі не падтрымліваліся дзяржаўнымі ўладамі. Не было дакладнага заканадаўства, асабліва калі гаварыць пра выезд у заходнім напрамку. У сувязі з гэтым на старонках «Нашай Нівы» неаднаразова ўздымаліся гэтыя пытанні. Так, у адным з нумароў газеты за 1910 г. адзначалася, «што ў нашых законах аб эміграцыі (выселеньні) бадай што нічога не сказано… таму часта людзі пераходзяць цераз расейскую граніцу саўсім без паспорта – патайна; калі ж іх зловяць пры гэтым, суд іх карае» [4, *4*]. Матэрыялы газеты часта істотна ўдакладняюць інфармацыю з іншых крыніц.

Рэдакцыя газеты спрабавала вызначыць асноўныя прычыны як унутранай (у межах Расійскай імперыі), так і знешняй міграцыі насельніцтва Беларусі. Найчасцей аўтары «Нашай Нівы» звярталі ўвагу на малазямелле сялянства, звязанае з хуткім ростам насельніцтва і недастатковай тэхнічнай абсталяванасцю гаспадарак, цераспалосіцу, неразвітасць прамысловасці, якая прыводзіла да павелічэння прапановы рабочай сілы і паніжэння ўзроўню заработнай платы ў краіне, канфесійную палітыку [1, *2–3*].

Аналіз матэрыялаў «Нашай Нівы» за 1906 – 1914 гг. дае падставы сказаць, што газета надавала асаблівую ўвагу сялянскай міграцыі. У ёй адзначаліся два накірункі вырашэння аграрнага пытання для сялян Беларусі: першы – пошук лепшай долі на Захадзе ці Усходзе, а другі – інтэнсіфікацыя і ўдасканаленне сялянскай гаспадаркі. Часта гэта выглядала як два этапы на шляху да паляпшэння сялянскага жыцця: зарабіць грошы на чужбіне, а потым пашырыць сваю гаспадарку на радзіме. Так, асабісты карэспандэнт газеты ў Паўночнай Амерыцы не толькі паказаў у сваіх артыкулах заробкі працоўных у ЗША, што былі ў 4–5 разоў вышэй, чым на радзіме, але і зазначыў, што «там нашы беларусы, не прывыкшыя да раскошнага жыцця, за 2–3 гады ўжо складаюць капітал і варочаюцца да сваіх родных вёсак з «амерыканскімі грашыма»… таму найменш тры чвэрці нашых мужыцкіх капіталаў – гэта з Амерыкі» [1, *1*]. Падобная інфармацыя была надрукавана і пра заробкі ў краінах Заходняй Еўропы [5, *6–7*]. Безумоўна, такія артыкулы, калі траплялі да сялян, не маглі не мець водгуку.

Нярэдка ў артыкулах «Аб эміграцыі» даваліся парады, як зрабіць неабходныя дакументы і пашпарт. Ёсць інфармацыя і пра цяжкасці на гэтым шляху: «… пакуль абойдзеш усе канцэлярыі, пакуль дастанеш усе патрэбныя дакументы і паспорт, дык і часу

шмат прыйдзецца страціць, і грошэй, а як яшчэ калі чэлавек цёмны, то справа ідзе ешчэ горш» [4, *3–4*].



Параўнальны аналіз матэрыялаў «Нашай Нівы» дазваляе сказаць, што інфармацыі і артыкулаў на старонках газеты пра перасяленне на Усход у некалькі разоў менш, чым пра заходні накірунак. Прычым уласныя карэспандэнты выдання з Сібіры пісалі не столькі пра ўмовы жыцця на чужбіне, колькі пра цудоўную прыроду [4, *41*]. Аднак заўсёды падкрэслівалася, што весці гаспадарку там цяжка. «Гэта папраўдзі «сьляпое» перасяленьне: …нашым беларусом больш памаглі б патрачэные на іх перасяленне грошы, калі б, заместа ў Сібіры, далі нашым селянам падмогу ў роднай старонцы, … як, напрыклад, банчкі [банкі. – *М. К.*] з танным крэдытам, школы сельскай гаспадаркі і паказныя хутары, дзе хлебароб мог бы навучыцца лепшых спосабаў гаспадаркі і, маючы крэдыт, здолеў бы іх у сябе завесці» [5, *8*].

У газеце «Наша Ніва» змешчана даволі вялікая колькасць статыстычнай інфармацыі, звязанай з міграцыямі беларускага насельніцтва (падлікі колькасці выехаўшых, параўнальныя падлікі кошту жыцця ў розных краінах, кошт пераезду на новае месца і інш.), але няма дадзеных, з якіх крыніц яна была атрымана. Нягледзячы на гэта, параўнальны аналіз з архіўнымі дадзенымі мае тэндэнцыю да адэкватнасці змешчанай там інфармацыі. Але пытанне аб статыстыцы патрабуе далейшага разгляду і з’яўляецца тэмай для далейшай навуковай працы.

Працэс тэрытарыяльнай мабільнасці насельніцтва Беларусі ў пачатку ХХ ст. залежаў ад вялікай колькасці фактараў, галоўным з якіх быў эканамічны. Міграцыі з'явіліся аб'ектыўным вынікам капіталістычнага развіцця паслярэформеннай беларускай вёскі, безумоўна, уплывалі на ўсе сферы тагачаснага сялянскага жыцця.


1. Наша Ніва. 1906. № 5.
2. Наша Ніва. 1907. № 31.
3. Наша Ніва. 1909. № 41.
4. Наша Ніва. 1910. № 4.
5. Наша Ніва. 1910. № 35.
6. Наша Ніва. 1911. № 3.
7. *Семейных З. М.* Аграрные миграции белорусского крестьянства в Сибирь в период империализма (1900–1914): Автореф. дис.… канд. ист. наук / АН Беларуси. Ин-т истории. Мн., 1986.
8. *Ціхаміраў А. В.* Беларуская эміграцыя: 90-я гг. 19 ст.–1917 г.: Аўтарэф. дыс.… канд. гіст. навук / АН Беларусі. Ін-т гісторыі. Мн., 1994.